# ДАСЛЕДЧЫЦКІЯ ЎМЕННІ Ў СТРУКТУРЫ ПРАФЕСІЯНАЛІЗМУ БУДУЧАГА ПЕДАГОГА

*Мітраш В. І.*

У сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй павінна атрымаць большую разгорнутасць даследчая работа, якая выступае неабходнай асновай як для фарміравання даследчыцкіх уменняў, так і для больш поўнага развіцця інтэлектуальных сіл будучага педагога.

Тэарэтычны аналіз псіхолага-педагагічнай літаратуры дазволіў вызначыць важнейшыя псіхолага-педагагічныя механізмы фарміравання даследчыцкіх уменняў у будучых педагогаў. Імі з'яўляюцца: змест і арганізацыя вучэбнай дзейнасці, якія фарміруюць шырыню сацыяльных і псіхолага-педагагічных інтарэсаў студэнтаў і стымулююць усведамленне прафесійна-педагагічнай дзейнасці як асабліва творчай; сувязь тэарэтычнага навучання з бесперапыннай практычнай дзейнасцю студэнтаў; сістэматычная рэфлексія на сваю тэарэтыка-практычную гатоўнасць да прафесійнай дзейнасці як дзейнасці развіцця канкрэтнай асобы дзіцяці.

Перадумовамі для разгортвання даследчай дзейнасці з'яўляюцца: развітасць пазнавальнай патрэбнасці; наяўнасць станоўчай матывацыі да вучэбна-творчай дзейнасці; развітасць лагічнага мыслення; наяўнасць вопыту эўрыстычнай дзейнасці; здольнасць да самакіравання і рэфлексіі. У якасці крыніц даследчай дзейнасці выступаюць таксама патрэбнасці грамадскага развіцця, дасягненні псіхолага-педагагічнай навукі і перадавога педагагічнага вопыту.

Працэс фарміравання даследчыцкіх уменняў у студэнтаў малодшых курсаў структурыруюць наступныя кампаненты:

- развіццё пазнавальнай патрэбнасці, якая забяспечвае ўстойлівы інтарэс да самастойнай даследчыцкай дзейнасці;
- фарміраванне каштоўнасных адносін да творчай, самастойнай дзейнасці, накіраванай на ўстойлівае развіццё асобы выхоўваемага;
- уключэнне студэнтаў у розныя віды групавой і індывідуальнай даследчай дзейнасці з мэтай аналіза педагагічнага вопыту;
- мэтанакіраванае развіццё лагічнага мыслення і фарміраванне вопыту эўрыстычнай дзейнасці ва ўсіх відах пазнавальнай дзейнасці;
- рэфлексія на сваю тэарэтыка-практычную гатоўнасць да рознабаковага развіцця асобы дзіцяці.

Устаноўка на аваладанне даследчыцкімі ўменнямі павышае ўзровень патрабавальнасці студэнтаў да сябе, актывізуе іх інтэлектуальную дзейнасць і садзейнічае фарміраванню ў іх культуры разумовай працы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ